*Алег Трусаў,*
***кандыдат гістарычных навук***

# ГРАФІКА ДАЎНІХ МУРОЎ

**З гісторыі будаўнічай тэхнікі ў манументальным дойлідстве Беларусі эпохі феадалізму**

Гісторыя будаўнічай тэхнікі — самастойная галіна архітэктурна-археалагічнага вывучэння манументальнага дойлідства. Яна адлюстроўвае ўвесь працэс узнікнення і развіцця мураванага дойлідства на Беларусі.

## ДОЙЛІДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

Дойлідская арганізацыя, альбо будаўнічая арцель,— карпарацыйнае аб'яднанне сярэдневяковых рамеснікаў, якія ўзводзілі манументальныя збудаванні. На тэрыторыі Беларусі самастойныя будаўнічыя арцелі дзейнічалі з XII да XVII стст. Як правіла, яны складаліся з дзесяткаў (да 30 чалавек) высокакваліфікаваных муляраў і цесляў, якія рабілі сталярку. У XII ст. у склад арцелі ўваходзілі яшчэ майстры, якія выраблялі плінфу і нарыхтоўвалі вапну. Майстры-цагельнікі сваю прадукцыю мецілі спецыяльнымі знакамі альбо клеймамі, што сведчаць пра мясцовыя традыцыі і сувязі паміж гэтымі арганізацыямі.

У XII—XIII стст. існавалі як манастырскія, так і княжацкія будаўнічыя арцелі. Кіравалі імі вопытныя майстры, якія адрозніваліся ад пазнейшых архітэктараў тым, што былі як практыкантамі, так і выканаўцамі. Толькі з XVIII ст. архітэктар стаў праектаваць, а інжынер-будаўнік выконваць.

У XII ст. на тэрыторыі Беларусі працавала некалькі самастойных будаўнічых арцеляў. З іх у Полацкай зямлі былі полацкая і віцебская. Полацкую арцель заснавалі на пачатку стагоддзя кіеўскія майстры, якія збудавалі Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра, а ў Віцебску ў сярэдзіне XII ст. Благавешчанскую царкву — візантыйскія майстры, якіх прывезлі з сабой полацкія князі [1].

Цяпер толькі ў Полацку вядомы 10 архітэктурных помнікаў, пабудаваных полацкай будаўнічай арцеллю. Да нас дайшло імя полацкага майстра Іаана, які пабудаваў Спасаўскую царкву Ефрасіннеўскага манастыра. Ён стварыў помнік вежападобнага тыпу. Кілепадобная форма арак і скляпенняў, выкарыстанне какошнікаў у аснове барабана вылучае Спасаўскую царкву сярод усіх іншых у тагачаснай Кіеўскай Русі. Віцебскія майстры ўзвялі асноўны аб'ём царквы ў Навагрудку, але завяршылі яе (прыбудова галерэі) полацкія. У канцы XII ст. манументальнае будаўніцтва ў Полацкай зямлі спынілася. У гэты час полацкія дойліды заклалі асновы мясцовай архітэктурнай школы ў Смаленску і ўдзельнічалі ў будаўніцтве ноўгарадскіх храмаў.

З дапамогай палачан (асабліва цагельнікаў) у другой палове XII ст. была створана самастойная будаўнічая арцель у Гродзенскім княстве. Нам вядома 6 манументальных пабудоў у Гродне і адзін храм (не закончаны) у Ваўкавыску, створаны рукамі гродзенскіх рамеснікаў.

З другой паловы XIII ст. на тэрыторыі Беларусі акрамя культавых і грамадзянскіх будынкаў з каменю і цэглы ўзнікае мноства абарончых збудаванняў. Гэта каменныя абарончыя вежы, якія часта называюцца валынскімі, і магутныя мураваныя замкі. Пераход да новай будаўнічай тэхнікі выклікаў патрэбу ў прафесійных дойлідах з іншых краёў. Так, валынскі дойлід Алекса ў 1276 г. залажыў крэпасць Камянец на р. Лясной. Мяркуюць, што ён у 1271—89 гг. пабудаваў Камянецкую вежу у драўляным замку.

У XIV ст. тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. З гэтых часоў да канца XVIII ст. будаўнічая тэхніка Літвы і Беларусі амаль не адрозніваецца, бо арцелі вандравалі па краіне без усялякіх абмежаванняў. На першую палову XIV ст. прыпадае будаўніцтва шматлікіх мураваных замкаў — надзейнага шчыта супраць крыжацкай навалы. Паколькі сваіх майстроў не хапала, запрашалі замежных. Па запрашэнню князя Гедыміна ў 30-ых гадах XIV ст. прыехалі паўночнанямецкія (ганзейскія) майстры. Магчыма, што яны ўдзельнічалі ў будаўніцтве Лідскага замка [2].

У XIV—XVII стст. колькасць членаў будаўнічых арцеляў (асабліва занятых на абарончых збудаваннях) павялічылася, часам да 100 чалавек і болей. Напрыклад, у 1497 г. на будаўніцтве Вострай брамы ў Вільні пад кіраўніцтвам майстра-архітэктара працавала 16 майстроў-муляраў, 96 рамеснікаў, якія ім дапамагалі, 48 цесляў, 300—400 падсобных работнікаў і 36 фурманоў, кожны з паркай коней [3].

У познім сярэднявеччы майстры, якія выраблялі цэглу і дахоўку, выйшлі з будаўнічых арцеляў, працавалі самастойна і прадавалі сваю прадукцыю непасрэдна заказчыку. Поруч з вандроўнымі арцелямі спачатку ў вялікіх дзяржаўных, а потым і ў прыватнаўласніцкіх гарадах ствараюцца цэхі муляраў. Першыя (магчыма, і будаўнічыя) цэхі з'явіліся на Беларусі з сярэдзіны XVI ст.[4]

Цэхавыя рамеснікі падзяляліся на ўласна майстроў, чаляднікаў (падмайстраў) і вучняў. Тэрмін авалодання рамяством у кожным цэху быў розны, напрыклад, у цесляў Мінска ён працягваўся 4 гады. Потым вучня пераводзілі ў чаляднікі і ён працаваў у майстра яшчэ 3—4 гады. Чаляднікі накіроўваліся ў так званую «вандроўку» — працу ў іншых гарадах на 1,5—3 гады. Прыбыўшы з «вандроўкі», чаляднік здаваў экзамен. У мінскіх цесляў ён складаўся з дзвюх частак: рабілі канструкцыю даху пад дахоўку, а потым унутраную лесвіцу ў жылым будынку. Акрамя ўмення вырашаць тэхнічныя задачы, абумоўленыя працэсам вытворчасці, прэтэндэнт на званне майстра павінен быў паказаць свае архітэктурна-мастацкія здольнасці [5].

З XVI ст. у беларускіх гарадах разам з цэхамі пачынаюць працаваць сапраўдныя архітэктары са спецыяльнай адукацыяй. Іх часта запрашалі з-за мяжы. Напрыклад, у 80-ыя гады XVI ст. Мікалай Радзівіл («Сіротка») запрасіў у Нясвіж італьянскага архітэктара Джыавані Марыю Бернардоні, які распачаў будаўніцтва новага бастыённага замка. Такія архітэктары — вольныя майстры — звычайна стаялі па-над цэхамі і абслугоўвалі толькі заможных магнатаў. Да канца XVIII ст. з імі працавалі і вандроўныя арцелі, на чале якіх былі майстры-самавукі. Так, Магілёўскую ратушу ў 1679 г. пачаў будаваць майстар Феска, а ў 1681 г. да яго далучыўся майстар Апанас. Ратушную вежу пабудавала арцель майстра Ігната [6].

У XVIII—XIX стст. з прычыны падзелу работ паміж архітэктарамі і будаўнікамі-практыкамі рамкі дзейнасці будаўнічых арцеляў звужаюцца, і яны паступова знікаюць.

## МУРОЎКА

Муроўка — размяшчэнне камянёў, каменных блокаў альбо цаглін у пэўнай сістэме, якая вызначаецца малюнкам швоў на паверхні сцяны. Тэхніка муроўкі — заўжды паказчык узроўню развітасці будаўніцтва. Яе ўдасканальванне, змена ў ёй розных тыпаў цэглы, сістэм перавязкі цаглін паміж сабою дазваляюць стварыць дакладную шкалу для датавання помніка архітэктуры. Калі фасад будынка не быў атынкаваны, малюнак муроўкі з'яўляўся асноўным фактарам паліхроміі ў манументальным дойлідстве.

Дэкаратыўныя ўласцівасці старажытных будаўнічых матэрыялаў і тэхніка іх апрацоўкі абумовілі развіццё арнаментальных матываў у манументальным дойлідстве Беларусі XI—XVI стст. Арнаменты, якія раскрываюць структуру рэчы, называюцца структурнымі, у адрозненне ад матываў, якія адлюстроўваюць прыродныя формы [7]. Структурны арнамент кожнага тыпу муроўкі дапамагае вызначыць архітэктурны стыль, а таксама высветліць паходжанне сістэмы муроўкі, этапы яе эвалюцыі, арэал распаўсюджання і час выкарыстання. Усе тыпы муроўкі, якія існавалі на Беларусі, можна падзяліць на тры вялікія групы: мяшаная (з камянёў і цэглы); цагляная; каменная (з валуноў альбо абчасаных блокаў).

Першы мураваны будынак на Беларусі — полацкая Сафія (сярэдзіна XI ст.) збудаваны ў тэхніцы мяшанай муроўкі (opus mixtum). Гэта — чаргаванне радоў палявых камянёў са слаямі плінфы, што звязвала ўсю канструкцыю. Амаль квадратная форма плінфы перашкаджала добра перавязваць швы. Таму на фасад выходзіў адзін рад цэглы, а тарцы плінфаў з прамежкавых радоў былі крыху «заглыблены» ў мур. Звонку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

Люблін. Фрэска «Тайная вячэра» ў алтарнай частцы Троіцкай капліцы. 1418. Дахі некаторых будынкаў накрыты паўцыркульнай дахоўкай. (Паводле В. Церашчатавай).





Мсціслаў. Паліваная дахоўка. Другая палова XVII ст.— першая палова XVIII ст.



Крэўскі замак. Гатычная нервюрная цэгла. XIV—XV ст.

РЕПОЗИТОРИЙ

Пліткі падлогі з Пінска. (Паводле Т. Раўдзінай).



Муроўкі: 1) «opus mixtum»; 2) «opus incertum»; 3) «са схаваным радам»; 4) дэкаратыўная мяшаная муроўка; 5, 6) дэкаратыўныя раўнарадныя муроўкі; 7, 8) лусковыя муроўкі; 9, 10) балтыйскія муроўкі; 11) «grand appareil»; 12, 13) мяшаныя муроўкі; 14) гатычная муроўка; 15) дэкаратыўная гатычная муроўка; 16, 17) рэнесансавыя муроўкі; 18) галандская муроўка.



гэтыя рады прыкрываліся цамяначнай рошчынай, прычым таўшчыня яе палоскі дасягала 15-20 см. Такая сістэма перавязкі плінфы атрымала назву муроўкі са схаваным, альбо ўтопленым, радам.

Муроўка са схаваным радам характэрная для полацкай архітэктурнай школы XII ст. Плінфа набывае прамавугольную форму, і канструкцыйная патрэба заглыбляць рады знікла. Засталася толькі дэкаратыўная функцыя. Звонку камяні ўжо не кладліся, яны сустракаюцца часам усярэдзіне цаглянага мура.

Мінскі храм пабудаваны, верагодна, у XII ст.— у тэхніцы чыстай каменнай муроўкі (grand appareil), калі ў сярэдзіне мур забутоўвалі камянямі, а вонкавую паверхню абкладвалі невялікімі прамавугольнымі блокамі вапняку. Такая муроўка мае назву opus incertum, ці mur emplekton[8]. Найбольш блізкія ёй аналагі прасочваюцца ў раманскім дойлідстве.

Тэхніка дэкаратыўнай мяшанай муроўкі вызначае віцебскую Благавешчанскую царкву XII ст. Яе муры складзены з добра абчасаных і падагнаных каменных блокаў, рады якіх аддзяляюцца адзін ад аднаго двума радамі плінфы. Звонку фасады былі атынкаваны тонкім слоем тынкоўкі — заціркі, потым іх паверхня разбівалася белымі вапнавымі палоскамі (таўшчынёй каля 1,5 см) на русты адпаведна памерам каменных блокаў. Аналагічная сістэма муроўкі, але менш дасканалая, ужыта пры будаўніцтве Барысаглебскай царквы XII ст. у Навагрудку. Такі ж прыём, але крыху зменены, выяўляецца ў архітэктуры іншых земляў Кіеўскай Русі.

У другой палове XII ст. гродзенскія дойліды распрацавалі арыгінальную дэкаратыўную раўнарадную муроўку. Асноўная частка муроў рабілася з плінфы, як і пры звычайнай раўнараднай муроўцы. Акрамя плінфы вонкавую паверхню фасадаў аздаблялі рознакаляровыя шліфаваныя камяні, паліваныя місы (Ніжняя царква) і пліткі, з якіх выкладаліся розныя крыжападобныя фігуры. Інтэр'еры храмаў, як правіла, не распісваліся фрэскамі, а ўяўлялі сабой роўную паверхню з плінфы і ружовай цамяначнай рошчыны. На гэтым фоне эфектна вылучаліся круглыя гарлавіны галаснікоў, умураваныя ў верхнія часткі скляпенняў і сцен. Тураўскі храм XII ст. і пабудаваны ў тэхніцы раўнараднай муроўкі, якая ў літаратуры атрымала назву кіеўскай.

З XIII да XVI стст., а ў абарончым дойлідстве да сярэдзіны XVII ст. для асноўных муроў ужывалася лусковая (двухпанцырная) канструкцыя, калі з цэглы альбо спецыяльна падабраных камянёў выкладалі вонкавыя паверхні (шчокі), а прамежкі паміж імі забутоўвалі кавалкамі цэглы і дробным каменем.

Балтыйская, альбо вендская, муроўка (чаргаванне двух, радзей трох лажкоў і тычка) уласцівая беларускаму дойлідству другой паловы XIII — сярэдзіны XIV стст. У першай палове XIV ст. бытавала чыстая каменная муроўка.

На працягу XIV—XVIII стст. у беларускай архітэктуры можна прасачыць развіццё мяшанай муроўкі з вялікіх і сярэдніх валуноў і буйнапамернай цэглы. У XIV ст. каменныя кліны, якія замацоўвалі асноўныя камяні, пастунова змяняюцца цаглянымі. У XVI ст. практыкаваліся два тыпы мяшанай муроўкі. У адным выпадку гэта — суцэльныя рады камянёў, раздзеленыя цэглай, у другім — валуны, хаатычна раскіданыя па ўсёй паверхні цаглянай муроўкі, вонкавая паверхня якой складзена

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Гальшанскі замак. Рэканструкцыя падлогі. Канец XVI ст.—пачатак XVII ст. Раскопкі І. М. Чарняўскага.



з тычкоў. На пачатку XVII ст. мяшаная муроўка ўжывасцца падчас будаўніцтва сутарэнняў, цокаляў і падмуркаў, з сярэдзіны гэтага стагоддзя — толькі падмуркаў.

Сістэма муроўкі, у якой чаргуюцца тычок і лажок, завецца гатычнай. У архітэктуры Беларусі яна пануе з сярэдзіны XIV да сярэдзіны XVI стст., а потым суіснуе разам з іншымі сістэмамі. З XV ст. вылучаецца дэкаратыўная гатычная муроўка, якая выкарыстоўвае перапаленую цэглу — клінкер. З такой цэглы, цёмна-сіняга, амаль чорнага колеру, выкладалі розныя ўзоры. Найбольш пашыраныя былі малюнкі ў выглядзе рамбічнай сеткі. Часам з перапаленай цэглы на фасадах культавых будынкаў выкладалі крыжы (Сынковіцкая царква) альбо ў муроўку ўключалі гарматныя ядры (касцёл у Камаях). Адзін з беларускіх храмаў канца XV — пачатку XVI стст. — царква ў Кодне — цікавы ўстаўкай на галоўным фасадзе з каляровай і пазалочанай паліванай кафлі з выявамі святых [9].

У сучаснай літаратуры гатычная муроўка мае яшчэ некалькі назваў. Польскія даследчыкі часта называюць яе польскай. У Польшчы яна знікае ў XVI ст., але час ад часу сустракаецца і ў XVIII ст. У гісторыі рускай архітэктуры гатычную муроўку называлі старарускай. У Расіі яна прымянялася з другой паловы XV да сярэдзіны XIX ст. і пазней.

Каменная муроўка XIV—XVI стст. арміравалася драўлянымі брусамі. Яны дапамаглі пазбегнуць утварэння шчылін і ўсадкі збудавання пры слабым грунце. У XVII ст. драўляную арматуру замянілі металічныя сувязі.

Рэнесансавая муроўка (чаргаванне радоў тычкоў і лажкоў) з'яўляецца з другой паловы XVI ст. У звычайным, больш распаўсюджаным яе варыянце месцы цагляных лажкоў супадаюць па вертыкалі. У XVII ст. азначыўся і крыжовы варыянт гэтай муроўкі, калі швы стыкаў лажкоў знаходзяцца адзін пад адным толькі ў кожным пятым радзе цэглы.

Галандская муроўка, што грунтуецца на чаргаванні радоў з адных тычкоў з радамі, дзе тычок змяняецца лажком, зрэдку назіраецца ў XVII ст. Яна зафіксавана даследчыкамі на фасадах замка ў Смалянах і палацавага комплексу ў Ружанах [10]. У XVI—XVII стст., асабліва ў фартыфікацыйным будаўніцтве, карысталіся чыстай тычковай муроўкай.

З другой паловы XVI ст. фасады будынкаў, як правіла, поўнасцю атынкоўваюцца, і малюнак муроўкі не чытаецца. Гэта прывяло да адраджэння раўнараднай муроўкі, дзе няма ніякай паслядоўнасці ў чаргаванні тычкоў і лажкоў. Напрыклад, усе помнікі магілёўскай архітэктурнай школы другой паловы XVII ст. маюць раўнарадную муроўку фасадаў.

Узнаўленне розных тыпаў муровак адбываецца ў XIX — пачатку XX стст., найбольш у архітэктуры рамантызму, псеўда- і неаготыкі, мадэрну.

### ЦЭГЛА

У наш час цэгла — адзін з асноўных будаўнічых матэрыялаў. Цэгла вынайдзена ў краінах Усходу, што не мелі такіх будаўнічых матэрыялаў, як дрэва і камень. У Еўропу яе прывезлі рымляне, але ў рымскай архітэктуры яна не запанавала, бо згодна з грэчаскай традыцыяй прызнавалі камень і тынкоўку.

У раннім сярэднявеччы вытворчасць цэглы ў Еўропе надоўга спынілася, і яе выраблялі толькі ў Візантыі, зберагаючы рысы рымскай будаўнічай тэхнікі, у тым ліку квадратную форму цагліны і невялікую яе таўшчыню.

З Візантыі цэгла ў X ст. прыйшла ў Кіеўскую Русь, дзе стала называцца «плінфа». На тэрыторыі Беларусі плінфа вядома з сярэдзіны XI ст., калі з яе ўзвялі Полацкую Сафію. Усю гісторыю вытворчасці цэглы на Беларусі можна падзяліць на два перыяды. Першы (сярэдзіна XI—XII стст.) характарызуецца тонкай цэглай-плінфай, другі (XIII—XVIII стст.) — буйнапамернай (брусковай) цэглай. Будаўнікі XI—XII стст. працавалі з плінфай двух фарматаў і болей. Прычым адзін быў асноўным, а іншыя складалі 20—30 % ад агульнай колькасці. Выраблялі плінфу ў драўляных формах з дном. Таму адна з пасцелей была шурпатай і часам мела адбітак дошкі. На шурпаты бок накладвалі рошчыну, значыць, цэгла клалася роўнай паверхняй уніз [11]. Гэтым, пэўна, дасягалася лепшае счапленне цаглін. Сушылі цэглу перад абпалам пад адкрытым небам, іншы раз на траве. Абпальвалі ў спецыяльных печах — напольных ці зладжаных у схіле якога-небудзь пагорка, звычайна высокага берага ракі.

Буйнапамерная цэгла трапіла на Беларусь, верагодна, з Валыні ў другой палове XIII ст. Самы ранні вядомы нам помнік з такой цэглы — Камянецкая вежа.

Буйнапамерную, альбо брусковую, цэглу ў літаратуры часта называюць літоўскай. Гэты тэрмін, як паведамляе С. Абрамаўскас, з'явіўся ў пісьмовых актах і дакументах XVI ст. Вялікага княства Літоўскага, якія пісалі на старабеларускай мове. Тады літоўскай называлі цэглу, што ішла на будаўніцтва замкаў. За межы княства тэрмін выйшаў у XVI—XVII стст. У Расіі пра літоўскую цэглу сталі пісаць з другой паловы XIX ст.

Вельмі адметная рыса гэтай цэглы — падоўжныя барозны на адным з яе шырокіх бакоў. З-за іх такую цэглу часта называюць «пальчаткай», бо спачатку барозны праводзіліся пальцамі па вільготнай гліне. Баразёначная цэгла акрамя Беларусі, Літвы і Украіны бытавала ў Паўночна-Усходняй Германіі, Польшчы і інш.

Тэхналогія яе вырабу і абпалу адрознівалася ад плінфавай. Яе падрабязна выклаў польскі даследчык А. Выробіш. Абпальвалі цэглу ў полі (прымітыўны, вясковы спосаб) альбо ў печах. У 1984 г. аўтарам падчас археалагічных даследаванняў Мірскага замка знойдзены рэшткі напольнай печы пачатку XVI ст., у якой абпальвалі цэглу для будаўніцтва замка.

Даследаванні паказалі, што цэгла-пальчатка спярша займела барозны ў выніку тэхналагічнай спецыфікі (у XIV ст. яны былі неглыбокія і зусім невыразныя), а потым асобныя арцелі цагельнікаў, шануючы традыцыі і дбаючы пра дадатковы эфект счаплення, свядома рабілі баразёначную цэглу [12].

На Беларусі і ў Літве, у адрозненне ад Польшчы, пальчатка існуе да канца XVIII ст. Напрыклад, ратуша ў Шклове збудавана ў 80-ыя гады таго ж стагоддзя з цэглы-пальчаткі. Пальчатка сустракаецца таксама ў муроўцы тагачасных помнікаў Украіны.

Хутчэй за ўсё, цэглу з роўнай паверхняй рабілі ў гарадах, дзе яна карысталася вялікім попытам. Гарадскія цагельнікі ра-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Знак на плінфе. XII ст. Полацк. Раскопкі М. Каргера. Архіў ЛАІА.



Гродзенская Каложская царква. Плітка падлогі. XIII ст. (Паводле Ю. Ядкоўскага).



ней сталі дастасоўваць для яе апрацоўкі роўную дошчачку (ці калі-нікалі грабеньчаты інструмент). Адбіткі пальцаў, асабліва на цэгле XVI—XVII стст., часта сведчаць пра вясковую, невялікую местачковую ці гарадскую вытворчасць для нейкай адной пабудовы. Заўважана, што большасць замкаў складзена з гэткай цэглы.

Вывучэнне беларускай буйнапамернай цэглы XIII—XVII ст. паказала, што яе фармат (асабліва таўшчыня) мяняўся не адначасова. Можна, аднак, прасачыць наступныя заканамернасці.

1) У замкавым будаўніцтве амаль заўсёды цэгла была большых памераў, чым у культавым і грамадзянскім. Павелічэнне фармату абумоўлівалася інтэнсіўнасцю вытворчасці цэглы, але пры гэтым якасць яе пагаршалася.

2) Поруч з цэглай-пальчаткай суіснавала цэгла з роўнай паверхняй.

3) У другой палове XVII ст. у беларускім дойлідстве пашыраецца тонкая цэгла, таўшчынёй ад 6,5 да 4,5 см. Цікава, што на паверхні магілёўскай цэглы барозны часта ідуць не паралельна бакавым граням, а наўкос. Знешнім выглядам і памерамі магілёўская цэгла вельмі нагадвае старажытную плінфу, што часам прыводзіла ў зман некаторых даследчыкаў [13]. Такая цэгла трапілася і ў раскопках Мсціслава, Гродна, Мінска.

У XI—XVII стст. існавала яшчэ і профільная цэгла. Цэглу XII ст. часта называюць лекальнай плінфай. Яна ішла на выкладку скругленых кутоў вонкавых лапатак, парталаў, слупоў, паўкалонак і г. д.

З XIV па XVII стст. ужывалася буйнапамерная профільная цэгла. Узоры такой цэглы XIV—XVI стст. выяўлены падчас раскопак у Гродне, Навагрудку, Лідзе, Крэве, Віцебску. Гэта цэгла стрэлападобнай формы, прызначаная для выкладкі рэбраў нервюраў, а таксама цэгла іншых форм для аркатурных паясоў, паўкалонак, аконных праёмаў і іншых архітэктурных элементаў. Выраблялі профільную цэглу двума спосабамі — фармоўкай і склюдаваннем. Так, усю профільную цэглу з Мірскага замка і Сынковіцкай царквы выразалі спачатку з сырцу, а потым абпальвалі.

Некаторая цэгла XI—XVI стст. мае на сваёй паверхні знакі (пукатыя выявы, малюнкі якіх былі выразаны ў драўляных сценках формы), клеймы (выявы, уціснутыя ў гліняную масу сырцу спецыяльным штампам) і меткі (выявы, нанесеныя на цэглу пальцам альбо нейкім вострым інструментам). Сімволіка разнастайных выяў у шэрагу выпадкаў звязана са спецыфікай цагельнай вытворчасці ў тую ці іншую эпоху, але сэнс клеймаў і знакаў, асабліва на плінфе, да сённяшняга часу не вытлумачаны. Большасць даследчыкаў лічыць іх знакамі майстроў-цагельнікаў, частка — знакамі заказчыкаў плінфы (пукатыя адбіткі).

На буйнапамернай цэгле знакі адсутнічаюць, а іх ролю выконваюць пераважна клеймы і меткі. Меткі зафіксаваны на цэгле з Гродзенскага і Лідскага замкаў, а клеймы (4 варыянты) — на цэгле з Мірскага замка. Пры аднолькавых знаках, клеймах, метках на цэгле з розных помнікаў можна гаварыць пра храналагічную блізкасць гэтых пабудоў.

## ПЛІТКІ ПАДЛОГІ

Падлога — важны элемент інтэр'ера старажытных пабудоў. У драўляным жыллі яе рабілі глінабітнай або насцілалі з дошак. Роля падлогі ў такіх памяшканнях не выходзіла за межы функцыянальнага прызначэння. Са з'яўленнем на ўсходнеславянскіх землях мураваных пабудоў з Візантыі прыносяцца і новыя традыцыі насцілання падлогі. У заходніх княствах Кіеўскай Русі керамічныя пліткі сталі асноўным матэрыялам для пакрыцця падлогі. Яны вызначаліся рознымі памерамі і формамі.

Пры раскопках храма-пахавальні ў Полацку знойдзены квадратныя пліткі, а таксама маленькія трохкутныя і фігурныя — у форме дугаў рознай шырыні. Яны пакрытыя жоўтай, зялёнай і чорнай палівамі. Гэта пакуль адзіны на Беларусі храм, дзе нароўні з пліткамі для пакрыцця падлогі прымянялася тоўстае шкло — смальта. Яна ўяўляе сабой пласціны таўшчынёй ад 0,6 да 0,8 см — квадраты, трохкутнікі і палоскі [14]. Разнастайныя паліваныя пліткі для падлогі знойдзены пры вывучэнні полацкіх храмаў — па вуліцы Горкага і Спасаўскай царквы Ефрасіннеўскага манастыра. Асаблівую цікавасць маюць пліткі з раскопак Верхняга замка ў Полацку. Пакрытыя

яны шэрай палівай з нанесенымі на яе каляровымі кружочкамі [15]. Бакі многіх вырабаў скошаныя, што дапамагала ім лепш трымацца на вапнавай рошчыне.

У другой палове XII ст. склалася своеасаблівая школа дойлідства ў старажытнай Гародні. Найбольш цікавая Ніжняя царква, дзе збярагліся фрагменты маёлікавай падлогі. Значным падабенствам да яе вызначалася падлога Прачысценскай царквы. Пліткі мацаваліся на падрыхтоўцы з вапнавай рошчыны, якая, у сваю чаргу, месцілася на глінянай падсыпцы. Асноўнай формай плітак у маёлікавым малюнку быў квадрат. З такіх плітак выкладалася падлога па ўсёй плошчы цэрквы, акрамя падкупальнай прасторы, прытвора і, магчыма, алтарнай апсіды [16]. Жоўтыя, зялёныя і карычневыя пліткі размяшчаліся ў шахматным парадку такім чынам, што колерныя дарожкі падыходзілі пад вуглом у 45° да восяў пабудоў. Варта зазначыць, што малыя квадраты ў Прачысценскай царкве (18×18 см) часам набіраліся з дзвюх трохкутных плітак. Тое самае назіраецца і ў Каложы. Паасобныя экземпляры плітак адшуканы ў Пінску, Друцку і Лагойску [17]. Як ні дзіўна, яны знаходзіліся па-за будаўнічымі комплексамі і большасць іх не мае слядоў рошчыны. Магчыма, яны клаліся ў драўляных храмах, на гліне. Квадратныя, трохкутныя і фігурныя пліткі, пакрытыя зялёнай, жоўтай, карычневай і блакітнай палівамі, выяўлены пры раскопках Барысаглебскай царквы ў Навагрудку. Некалькі кавалкаў жоўтых і зялёных паліваных плітак знойдзена і ў Тураве [18]. Да XIII ст. можна аднесці тоўстыя тэракотавыя пліткі з рэльефным арнаментам на паверхні з Каложскай царквы [19].

У XIV—XV стст. адбываюцца карэнныя змены ў архітэктурным стылі на Беларусі — ідзе працэс станаўлення і развіцця готыкі. Пліткі цалкам знікаюць з інтэр'ераў. Падлогу ў гэты час насцілаюць з цэглы, нярэдка спецыяльнай — нязначнай таўшчыні.

З XVI ст. некаторыя падлогі ў інтэр'ерах мураваных пабудоў зноў пачынаюць рабіць з керамічных плітак. Пераважная іх колькасць непаліваная. Парубежжам XVI—XVII стст. датуюцца фрагменты квадратных і шасцігранных, выцягнутых па дзвюх паралельных гранях плітак з Мірскага замка, якімі набіраліся два тыпы падлогі таўшчынёй 3 і 4 см. Ромбападобныя і квадратныя пліткі знайшлі археолагі пры вывучэнні пабудоў магілёўскага Мікольскага манастыра і жылога будынка другой паловы XVII ст.

Як XVI, так і XVII ст. уласцівыя і паліваныя пліткі. Пліткі з зялёнай палівай засведчаны раскопкамі Г. В. Штыхава ў Лагойску, квадратныя паліваныя, а таксама шасцігранныя і ромбападобныя — навагрудскай Барысаглебскай царквы [20]. Падчас раскопак у Гальшанскім замку (канец XVI — пачатак XVII стст.) высветлена, што тут былі разнастайныя паводле форм пліткі падлогі. Мудрагелістыя ўзоры ўтвараліся з тэракотавых зорка- і крыжападобных, прамавугольных плітак. Але найбольш каштоўныя фрагменты плітак з зялёнай і карычневай палівамі [21]. Ёсць таксама паліваныя пліткі XVII ст. з Мсціслава і Мінска.

Керамічныя падлогі шырока рабілі і ў перыяд барока. Пры гэтым істотных адрозненняў у параўнанні з перыядамі рэнесансу і маньерызму не акрэсліваецца. На Беларусі былі распаўсюджаны пліткі прамавугольных і больш складаных форм [22].

## ЧАРАПІЦА (ДАХОЎКА)

На Беларусі чарапіца вядома з XIV ст. Старадаўняя назва яе аж па XVIII ст. — дахоўка. Гэта быў адзін з самых трывалых, вогнестойкіх і даўгавечных матэрыялаў для даху. Пэўную ролю, асабліва ў познім сярэднявеччы, адыгрывала дахоўка і ў дэкаратыўным аздабленні манументальных будынкаў.

У канцы XIV — пачатку XV стст. яна была паўцыркульная, альбо жалобчатая, потым яе замяніла пляскатая (XV—XVII стст.) і хвалістая, альбо галандская (мяжа XVII—XVIII — пачатак XX стст.) [23]. Каньковай дахоўкай на працягу ўсяго часу накрывалі ўсе схілы і самы верх стромкіх сярэдневяковых дахаў. Часам яна ўпрыгожвалася геаметрычным арнаментам, зробленым да абпалу. Узоры такой дахоўкі XIV—XV стст. выявіла ў Навагрудку М. Малеўская [24].

Самыя раннія фрагменты дэкаратыўнай гатычнай дахоўкі першай паловы XVI ст. далі нам раскопкі ў Мірскім замку. Паўцыркульная, яна мела доўгі (да 8,5—9 см) выступ накшталт птушынай галавы і мацавалася да кроквы вялікім цвіком. Паліванай цёмна-зялёнай дахоўкай накрываўся востры верх даху гатычнага будынка (напрыклад, касцёл у Ішкалдзі). Падобная дахоўка захавалася на касцёле св. Ганны ў Вільнюсе.

Дэкаратыўная дахоўка розных тыпаў выкарыстоўвалася і ў першай палове — сярэдзіне XVII ст. Пры рэстаўрацыі Брыгіцкага касцёла ў Гродне адкрыты два тыпы чорнаглянцаванай дахоўкі [25]. Да першай паловы XVII ст. можна аднесці фрагмент жалобчатай каньковай дахоўкі, якая трапілася ў Мінску пры рэстаўрацыі Петрапаўлаўскай царквы. Шырокі край яе ўпрыгожаны налепам.

У XVI—XVII стст. асноўная частка дахоўкі была пляскатай. Ёю накрывалі дахі з вялікімі схіламі. Збярагліся старажытныя малюнкі і ўзоры драўлянай пластыкі, на якіх добра відаць сістэма размяшчэння дахоўкі на высокіх будынках XVI—XVII стст. Пляскатая дахоўка накладвалася адна на адну, прычым крыць дах пачыналі знізу ўверх. На паверхні даху былі бачныя толькі паўкруглыя канцы даховак, што нагадвалі рыбіну луску. (Нездарма ў Польшчы пляскатая дахоўка завецца «карпюўка», бо малюнак, які яна ўтварае, падобны на луску карпа). Найважнейшы элемент, паводле якога датуецца дахоўка,— форма мацавальнага выступу, якая мянялася адпаведна змене канструкцыі даху.

Акрамя звычайнай чырвонай, радзей задымленай дахоўкі ў XVII ст. выраблялі і паліваную, што пацвярджаюць археалагічныя знаходкі ў Каложскай царкве яшчэ ў XIX ст., і чарапічныя фрагменты, пакрытыя зялёнай альбо шэра-зялёнай палівай, што сабраны ў Магілёве, Мсціславе і Оршы. Зялёнай альбо карычнева-зялёнай дахоўкай была накрыта і Барысаглебская царква ў Навагрудку [26]. Прыгожыя дахі пад паліванай дахоўкай згадваюцца і ў пісьмовых крыніцах. Зрэдку дэкаратыўнай чарапіцай аздабляліся будынкі канца XIX — пачатку XX стст. у неагатычным стылі.

---

1 Раппопорт П. А. Полоцкое зодчество XII в. // Советская археология. 1980. № 3. С. 158.
2 Вагласов С. Г., Трусов О. А. Историко-архитектурные исследования и реставрация Лидского замка // Вопросы архитектуры Литовской ССР. Т. VII (II). 1981. С. 29.
3 Narbutt T. Pomniejsze pisma Historycznie szczególnie do Historyi Litwy odnoszącesie. Wilno, 1856. S. 195.
4 Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн., 1975. С. 86.
5 Сергачев С. А. Деревянная архитектура Белоруссии XVI—XIX вв. Мн., 1984. С. 17—18.
6 Историко-юридические материалы. Витебск, 1887. Вып. I. С. 66, 158; Там сама, 1878. Вып. 9. С. 127.
7 Кес Д. Стили мебели. Будапешт. 1979. С. 14.
8 Zwolinska K., Maliski Z. Mały słownik terminów plastycznych. Warszawa, 1974. S. 254, 391.
9 Квитницкая Е. Д. Малоизвестные сооружения Белоруссии конца XV—начала XVI вв. // Архитектурное наследство. 1967. Вып. 16. С. 9.
10 Баравы Р. В. Да гісторыі замка ў Смалянах // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 3. С. 19; Ходыко Т. В. Дворцовый комплекс в Ружанах // Строительство и архитектура Белоруссии. 1974. № 3. С. 39.
11 Штыхов Г. В. Древнеполоцкое каменное зодчество // Белорусские древности. Мн., 1967. С. 267.
12 Трусаў А. Вялікапамерная цэгла // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. № 1. С. 34.
13 Трусаў А. А., Чарняўскі І. М., Кукуня В. Р. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні гістарычнага цэнтра Магілёва // Весці АН БССР, серыя грамадскіх навук. 1983. № 5. С. 74—75.
14 Раппопорт П. А. Полоцкое зодчество XII в. // Советская археология. 1980. № 3. С. 148—149.
15 Штыхов Г. В. Древнеполоцкое каменное зодчество. Мал. 5:9.
16 Малевская М. В. К реконструкции майоликового пола Нижней церкви в Гродно // Культура древней Руси. М., 1966. С. 146. Чарняўскі І. М., Жаровіна Г. П. Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 4. С. 36.
17 Равдина Т. В. Поливные керамические плитки из Пинска // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. 1963. Вып. 96. С. 114; Алексеев Л. В. Раскопки в Друцке. Археологические открытия 1965 г. М., 1966. С. 169; Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. Мал. 38:11.
18 Архіў Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі АН СССР, ф. 35, воп. 16, адз. зах. 88/1965. Дневник археологической экспедиции ЛОИА и ЛГУ 1965. С. 5—8, 25; Полубояринова М. Д. Раскопки древнего Турова (1961 г.) // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. 1963. Вып. 96. С. 47.
19 Воронин Н. Н. Древнее Гродно.— Материалы и исследования по археологии СССР. № 41. М., 1954. С. 26. Мал. 50:1.
20 Архіў Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі АН СССР, ф. 35, воп. 1, адз. зах. 80/1965. С. 3.
21 Чарняўскі І. М. Замак у Гальшанах // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 3. С. 42.
22 Трусаў А. А., Чарняўскі І. М. Керамічныя падлогі ў інтэр'ерах помнікаў дойлідства беларускага сярэднявякоўя // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. Мн., 1985. С. 192—193.
23 Трусаў А. А. Беларуская чарапіца // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 1. С. 30—32.
24 Захоўваецца ў фондах Ноўгарадскага дзяржаўнага аб'яднанага музея-запаведніка.
25 Трусов О. А. Белорусская черепица XIV—XVIII вв. // Советская археология. 1986. № 3. С. 189.
26 Знойдзена падчас раскопак М. Каргера ў 1961—62 і 1964—65 гг. Захоўваецца ў фондах Ноўгарадскага дзяржаўнага аб'яднанага музея-запаведніка.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ